Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі

ШЧУЧЫНШЧЫНА

краязнаўчы каляндар

2027 год



Шчучын, 2026

Краязнаўчы каляндар на 2027 год складзены на аснове звестак з энцыклапедычных выданняў і зборнікаў:

- Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск:БелЭн., 1996-2004;
- Рэспубліка Беларусь: энцыкл : в 6 т. – Мінск: БелЭн., 2005-2008;
- Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн.,1993-2003;
- Культура Беларусі: энцыкл.: у 6 т. – Мінск: БелЭн., 2010-2015;
- Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX стст: энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн., 1995;
- Гродненщина в лицах: [биографический справочник / составители: Ю. И. Косицкий, Л. В. Мальцева, М. А. Комарова; редколлегия: В. В. Кравцов и др.]. - Минск: Белтаможсервис, 2018. - 245 с.
- Пяткевіч А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / Аляксей Пяткевіч.- Гродна, 2000;
- Культура Гродзеншчыны: Факты. Падзеі. Асобы . – Мінск, 2014;
- Ермоленко Е. А. 400 имён: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины / В. А. Ермоленко, В. Н. Черепица. – Гродно, 2014;
- Лауреаты премии имени А. И. Дубко "За творческие достижения в области культуры и искусства" / [И. И. Аникевич и др.; составители: Е. В. Климович, Л. Ч. Новицкая; редакционный совет: В. А. Лискович (председатель) и др.]. - Гродно: Гродненская типография, 2018. - 267 с.
- Памяць: Шчучынскі раён. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 590 с.

- Данскіх, С. Стагоддзі і падзеі Шчучынскай зямлі / Сяргей Данскіх . – Баранавічы: Баранов. укруп. тип., 2007. – 252 с.
- Щучинский район: фотоальбом. – Гродно: ГОУПП”Гродненская типография”, 2015. – С.43.

У календары ўказваюцца сувязі дзеячоў са Шчучыншчынай, змешчаны звесткі аб 33 юбілеях прадстаўнікоў розных галін дзейнасці, прадпрыемстваў, арганізацый, ўстаноў.

У 2027 годзе спаўняецца:

330 гадоў з дня нараджэння **Расоцкага Сымона** (1697 - 1752), рымска-каталіцкага царкоўнага дзеяча, рэктара Шчучынскага калегіума піяраў.

285 гадоў з часу заснавання ў Шчучыне (1742 г.) Тэрэзай Хлябіцкай-Юзэфовіч Сцыпіён **шпіталя** і запрашэння ў мястэчка сясцёр міласэрнасці.

220 гадоў з дня нараджэння **Дмахоўскага Вікенція Ігнатавіча** (1807, в. Нагародавічы — 22 лютага 1862, Вільна) — мастака, пачатковую адукацыю атрымаў у піярскім вучылішчы ў Шчучыне.

190 гадоў з дня нараджэння **Карскага Івана Ануфрыевіча** (1837, в Лаша Гродзенскага раёна - ?), беларускага этнографа, фальклярыста, у 1898 г. служыў псаломшчыкам у в. Сабакінцы Шчучынскага раёна.

160 гадоў з дня нараджэння **Бен-Авігдора** (сапр. Шалковіч Аўрахам; 1867, г.п. Жалудок - 1921), яўрэйскага выдаўца, пісьменніка.



55 гадоў з часу адкрыцця **Жалудокскай дзіцячай школы мастацтваў** (1972).

55 гадоў з часу адкрыцця **Ляшчанскага сельскага клуба** (1972).

55 гадоў з часу адкрыцця **Навадворскага Дома культуры** (1972).

Студзень



1 - 85 гадоў з дня нараджэння **Чашчэвіка Антона Баляслававіча (**нар. у 1942 г. в. Тур'я), доктара біялагічных навук (1989), прафесара (1989), аўтара каля 400 навуковых публікацый, у тым ліку 26 кніг.



2 – 90 гадоў з дня нараджэння **Васько Уладзіміра Гаўрылавіча** (нар. у 1937 г., в. Ліпічанка), беларускага паэта, журналіста. Працаваў у шчучынскай раённай газеце "Чырвоны сцяг" (1959-1960).



6 - 65 гадоў з дня нараджэння **Хелскага Уладзіміра Уладзіміравіча** (нар. у 1962 г., в. Ваўчкі), дырэктара ДУА «Орлеўская сярэдняя школа імя С. П. Шупені», трэнера школьнай каманды па хакеі «Арлята». Яго імя ўнесена ў Кнігу Славы Шчучынскага раёна (2025).



10 - 75 гадоў з дня нараджэння **Карко Віктара Станіслававіча** (нар. у 1952 г., в. Жалудоцкія Баяры), беларускага вучонага ў галіне электратэхнікі.



16 – 95 гадоў з дня нараджэння **Ліневіча Яраслава Львовіча** (1932, в. Беліца, Лідскага р-на 24.01.2024, Минск) — савецкага і беларускага архітэктара, заслужанага архітэктара БССР (1982), галоўнага архітэктара

горада Мінска (1989—1994). У 1950 г. скончыў Шчучынскую сярэднюю школу № 1.

Люты



19 - 70 гадоў з дня нараджэння **Сцяпанчанкі Ганны Аляксандраўны** (нар. у 1957 г. , в. Бобра, Шчучынскага раёна), паэткі, бібліятэкара, лаўрэата прэміі імя А.І. Ду

бко за творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў намінацыі “Бібліятэкар года” (2011).

Сакавік

3 – 85 гадоў з дня нараджэння **Карацінскай Дар’і Мікалаеўны** (нар. у 1942 г., г.п. Астрына Шчучынскага раёна), беларускага мовазнаўца. З 1965 г. працавала ў ГрДУ імя Я. Купалы.

25 – 75 гадоў з дня нараджэння **Нікольскага Уладзіміра Мікалаевіча** (1952, г.п. Жалудок) беларускага мастака (графіка, жывапісца). Жыве і працуе ў Лідзе.

Красавік

17 – 65 гадоў з часу далучэння да Шчучынскага раёна г.п. Жалудка і 8 сельсаветаў скасаванага Жалудоцкага раёна (1962 г.).

Май

5 — 85 гадоў з часу стварэння (1942 г.) першага на Шчучыншчыне **партызанскага атрада “Арлянскі”.**




22 – 75 гадоў з дня нараджэння **Куца Барыса Міхайлавіча** (нар. у 1952 г., в Рыбакі), беларускага дзяржаўнага і гаспадарчага дзеяча. У 1990 – 1992 гг. – намеснік старшыні Шчучынскага раённага Савета народных дэпутатаў, у 1992 – 2017 гг. – старшыня калгаса “1 Мая” .

Ліпень



31 – 70 гадоў з дня нараджэння **Дарашкевіча Мікалая Аляксандравіча** (нар. у 1957 г., в.

Сіняцеўка, Астрынскага с/с), беларускага біёлага, дырэктара ТАА “НВК “Біятэст” (1990 - ?.



31 – 225 гадоў з дня нараджэння **Дамейкі Ігната Іпалітавіча** (1802 - 1889), вучонага – геолага, даследчыка Чылі. Скончыў школу піяраў ў Шчучыне.

Жнівень



1 – 105 з дня нараджэння **Глазкова Іллі Міхайлавіча** (1922 г., г. Генічаск Херсонскай вобласці – 1997, Мінск), камісара партызанскага атрада "Чырвонагвардзейскі» брыгады імя У. І. Леніна Шчучынскага партызанскага злучэння.



10 – 70 гадоў з дня нараджэння **Куляшова Мікалая Васільевіча** (нар. у 1957 г., в. Галавічполе), беларускага фізіка, педагога, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, выдатніка адукацыі Беларусі.



28 – 90 гадоў з дня нараджэння **Багдзевіча Іосіфа Міхайлавіча** (нар. у 1937 г., в. Васілішкі), беларускага вучонага ў галіне аграхіміі і сельскагаспадарчай радыёэкалогіі, акадэміка НАН Беларусі, доктара сельскагаспадарчых навук, прафесара.



31 — 65 гадоў з часу прыдання Шчучыну статуса горада раённага падпарадкавання (1962 г.)

Верасень

1 - 510 гадоў з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах **г. Шчучына** (1517).



19 – 80 гадоў з дня нараджэння **Шышко Іосіфа Вацлававіча** (нар. у 1947 г., в. Старадворцы Шчучынскага раёна), беларускага гаспадарчага дзеяча, эканаміста, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі, кавалера ордэна крыжа прападобнай Еўфрасінні Полацкай. У 1971 – 1982 гг. працаваў на Шчучынскім масласырзаводе. У 1982 – 2011 гг. –генеральны дырэктар ААТ “Малочны свет” у Гродне.

Кастрычнік



20 – 135 гадоў з дня нараджэння **Тарасевіча Янкі** (Ян Міхайлавіч; 1892, в. Клешнякі - 1978), беларускага рэлігійнага і грамадскага дзеяча, выдаўца, доктара тэалогіі.




22 -70 гадоў з дня нараджэння **Дзегцяровай Ірэны Пятроўны** (нар. у 1957 г., в. Ялашаўцы), Працавала дырэктарам Дома піянераў і школьнікаў г. Шчучына, ДУА "Шчучынскі Палац творчасці дзяцей і моладзі" (1991 - 2026). Яе імя ўнесена ў Кнігу Славы Шчучынскага раёна (2023).

Лістапад



9 – 75 гадоў з дня нараджэння **Маглыш Сабіны Сцяпанаўны** (нар. у 1952 г., в. Патока), беларускага біёлага, хіміка, эколага, кандыдата біялагічных навук.



11 – 90 гадоў з дня нараджэння **Майстровіча Анатолія Паўлавіча** (нар. у 1937 г., в. Загорычы Мозырскага р-на - 2024), заслужанага ўрача Рэспублікі Беларусь (1997), ганаровага грамадзяніна г. Шчучына, галоўнага ўрача Шчучынскай раённай бальніцы (1972 - 2001).

Снежань

5 – 6 — 215 гадоў з часу вызвалення Шчучыншчыны ад напалеонаўскіх войск (1812 г.).



13 – 110 гадоў з дня нараджэння **Белякова Мікалая Мікітавіча** (1917 - 2000), ганаровага грамадзяніна г. Шчучына.